# На польскай зямлі

У сакавіку гэтага года ў складзе дэлегацыі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза мне пашчаслівілася быць на III з'ездзе Польскай аб'яднанай рабочай партыі, які праходзіў у Варшаве. Знаходжанне ў сталіцы Польскай Рэспублікі і радзе іншых раёнаў дало магчымасць бліжэй пазнаёміцца з ростам эканомікі і культуры краіны, з людзьмі, якія будуюць новае жыццё на сацыялістычных пачатках.

Як толькі мы перасеклі дзяржаўную граніцу і ўступілі на польскую зямлю, адразу ж пераканаліся, што знаходзімся сярод сяброў і братоў. Усе, з кім мы сустракаліся, з радасцю расказвалі аб сваіх поспехах у будаўніцтве новай Польшчы, аб працоўным энтузіязме народа, яго імкненнях да дружбы і міру.

Калі праязджаеш па гарадах і сёлах, здзіўляе пафас стваральнай працы польскага народа. Усюды відаць рыштаванні новабудоўляў, узводзяцца новыя фабрыкі і заводы, ствараюцца кааператыўныя гаспадаркі. Мы захапляліся той гіганцкай работай, якую прарабіў польскі народ пад кіраўніцтвам Польскай аб'яднанай рабочай партыі, шчыра, ад усёй душы, радаваліся яго поспехам у развіцці эканомікі і культуры, уздыме дабрабыту працоўных, умацаванні народна-дэмакратычнай дзяржавы.

З руін і попелу адрадзілася сталіца Польшчы — Варшава. Тут радуюць вока прыгожыя шматпавярховыя дамы, асфальтаваныя вуліцы, шырокая, быццам вычарчаная па лінейцы, магістраль «Усход — Захад». Працоўныя Польшчы ўдзяляюць вялікую ўвагу добраўпарадкаванню Варшавы, развіццю яе прамысловых раёнаў.

Вось індустрыяльныя раёны сталіцы Млоцінт, Служэўцы, Жэрань і іншыя. За гады народнай улады тут занава пабудаваны аўтамабільны завод, завод якасных сталей, камбінаты будаўнічых матэрыялаў, заводы радыёапаратуры, электраабсталявання, шарыкападшыпнікаў, тэлевізараў. Усе гэтыя прадпрыемствы забяспечаны перадавой тэхнікай, на іх працуюць выдатныя майстры сваёй справы.

У гутарках жыхары польскай сталіцы ахвотна расказвалі аб усім, чым яны законна ганарацца. А ганарыцца ёсць чым. За гады народнай улады ў Варшаве пабудавана і рэканструявана больш 1 500 буйных і сярэдніх прадпрыемстваў, няўхільна расце прамысловая вытворчасць. Аб'ём прамысловай прадукцыі варшаўскіх прадпрыемстваў павялічыўся ў параўнанні з даваенным узроўнем больш чым у 7 разоў. Варшавяне, як і ўвесь польскі народ, ад душы дзякуюць савецкіх людзей за вызваленне іх радзімы ад гітлераўскіх захопнікаў, за бескарыслівую дапамогу ў развіцці эканомікі і культуры свабоднай і незалежнай Польшчы.

Да цэнтра Варшавы вядуць шырокія магістральныя лініі. Тут узвышаецца Палац культуры і навукі — сімвал непарушнай дружбы савецкага і польскага народаў. Гэтая дружба змацавана крывёй, пралітай ў мінулай вайне за шчасце народаў, яна сцэментавана цяпер нашай агульнай, адзінай мэтай. Савецкі ўрад у ліпені 1954 года перадаў Палац у падарунак польскаму народу. У яго будаўніцтве прымалі ўдзел савецкія рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі, у тым ліку і Беларускай ССР, сярод якіх былі і віцябляне — рабочыя домабудаўнічага камбіната тт. Баранаў, Новікаў і іншыя.

Як да радаснага, знамянальнага свята рыхтаваліся камуністы, увесь польскі народ да III з'езда Польскай Аб'яднанай рабочай партыі.

XII пленум ЦК ПАРП, які адбыўся ў кастрычніку мінулага года, зацвердзіў праекты дырэктыў па развіццю народнай гаспадаркі Польскай рэспублікі на 1959—1965 гады, па пытанню палітыкі партыі ў вёсцы, а таксама аб змяненнях у Статуце ПАРП. Напярэдадні з'езда гэтыя дакументы шырока абмяркоўваліся ў партыйных арганізацыях.

Усе камуністы, увесь польскі народ горача адобрылі распрацаваныя планы эканамічнага развіцця краіны, якія з'яўляюцца далейшай праграмай сацыялістычнага будаўніцтва ў народнай Польшчы. Абмеркаванне гэтых дакументаў вылілася ў яркую дэманстрацыю згуртаванасці польскага народа вакол сваёй партыі.

III з'езд Польскай аб'яднанай рабочай партыі, які праходзіў з 10 па 19 сакавіка 1959 года, прадэманстраваў гранітную непарушнасць, адзінства і згуртаванасць партыйных радоў. У пасяджэннях з'езда прынялі ўдзел 1 411 дэлегатаў з 1 431, выбранага на 19 ваяводскіх канферэнцыях, на партыйных канферэнцыях буйных прадпрыемстваў і ў арміі.

На III з'ездзе ПАРП прысутнічалі дэлегацыі камуністычных і рабочых партый 44 краін. Сярод гасцей — дэлегацыя Камуністычнай партыі Савецкага Саюза на чале з членам Прэзідыума ЦК КПСС тав. Н. Г. Ігнатавым, дэлегацыя Камуністычнай партыі Кітая на чале з тав. Чжу Дэ, дэлегацыі брацкіх партый усіх сацыялістычных краін, а таксама дэлегацыі камуністычных партый Францыі, Італіі, Вялікабрытаніі, Інданезіі, Індыі, Сірыі, Аргенціны і іншых. Дэлегаты з'езда арганізавалі бурную авацыю прадстаўнікам брацкіх партый, дэманструючы адзінства і згуртаванасць, вернасць пралетарскаму інтэрнацыяналізму.

Адкрываючы з'езд, першы сакратар ЦК ПАРП Уладзіслаў Гамулка заявіў:

— Польская аб'яднаная рабочая партыя сабралася тут на свой III з'езд партыі. Гэта трэці з'езд партыі з дня аб'яднання польскага рабочага руху, якое адбылося 10 гадоў назад. Наш сённяшні з'езд — гэта новая веха на шляху пабудовы сацыялізма ў Польшчы.

III з'езд Польскай аб'яднанай рабочай партыі абмеркаваў наступныя пытанні: Справаздачу Цэнтральнага Камітэта ПАРП — даклад першага сакратара ЦК ПАРП Уладзіслава Гамулкі; Аб дырэктывах па развіццю народнай гаспадаркі ў 1959—1965 гадах — даклад члена Палітбюро ЦК ПАРП Стэфана Ендрыхоўскага; Аб палітыцы партыі ў вёсцы — даклад члена Палітбюро ЦК ПАРП Эдварда Охаба; Аб змяненнях у Статуце партыі — даклад члена Палітбюро ЦК ПАРП Рамана Замброўскага; Справаздачу Цэнтральнай рэвізійнай камісіі ПАРП. На з'ездзе выбраны кіруючыя партыйныя органы: Цэнтральны Камітэт і Цэнтральная рэвізійная камісія ПАРП.

III з'езд Польскай аб'яднанай рабочай партыі прайшоў у абставінах згуртаванасці і адзінства партыйных радоў, пад знакам мабілізацыі мас на выкананне генеральнай лініі ПАРП — лініі пабудовы сацыялізма. З'езд падвёў вынікі работы партыі і ўсіх працоўных краіны за апошнія гады і намеціў далейшыя задачы ў вялікай справе сацыялістычнага будаўніцтва. Гэты з'езд мае велізарнае значэнне не толькі для польскага народа, але і для ўсіх краін сацыялістычнага лагера. Польская Народная Рэспубліка, паспяхова развіваючы сваю эканоміку і культуру, уносіць уклад у развіццё магутнасці краін сацыялістычнага лагера. Непахіснай вернасцю прынцыпам міжнароднай пралетарскай салідарнасці Польская аб'яднаная рабочая партыя заваявала павагу і ўдзячнасць брацкіх марксісцка-ленінскіх партый рабочага класа.

У справаздачным дакладзе ЦК ПАРП дадзен глыбокі, змястоўны марксісцка-ленінскі аналіз сучаснай абстаноўкі і сацыялістычнага бу-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы